Адвэнтавае чаканне – таямніца

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
05.12.2021 00:00



Разам з пачаткам Адвэнту мы пачынаем новы літургічны год. Для кожнага чалавека гэта новы этап жыцця, які нібыта чысты аркуш паперы для запісаў. Гэта яшчэ адзін шанс запрасіць Бога ў сваё штодзённае жыццё, таму што мы перажываем Адвэнт менавіта тут і цяпер, дзе знаходзімся: у нашых сем,ях, на месцах працы ці вучобы, карыстаючыся багаццем традыцый і звычаяў.

Адвэнтавае чаканне – гэта таямніца, якую варта крок за крокам адкрываць, а не разыгрываць. Аўтэнтычна – як умеем і як можам, не імкнучыся ні да перфекцыянізму, ні да абвінавачвання сябе перад Богам. Езус Хрыстус не прыходзіць да праведнікаў, Ён прыходзіць да грэшнікаў, слабых і кволых людзей, якія мы ёсць на самой справе. † Зб аўца прыходзіць у свет далікатна, як дзіця, з незразумелай любоўю, супакоем і радасцю, якімі хоча напоўніць нас да краёў. Можна прыняць гэтыя ласкі з удзячнасцю, але можна таксама адхіліць іх і страціць.

Давайце добра выкарыстаем кожны момант гэтага святога часу. Няхай нам у гэтым дапаможа патрабавальны, строгі аскет Ян Хрысціцель, а таксама ўнутрана засяроджаная і лагодная Марыя. Яны могуць дапамагчы нам, каб Бог “пасяліўся між намі”.